УДК 94(075.8)
ББК 63.3я73
Б142

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэцэнзенты:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян БДУ *Л. А. Козік;*
кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны РІВШ *С. В. Паноў*

Пад навуковай рэдакцыяй *А. В. Касовіча*

**Багдановіч, І. І.**
Б142 Методыка навучання гісторыі ў школе ў апісаннях, схемах і табліцах : вучэбна-метадычны дапаможнік / І. І. Багдановіч, А. А. Корзюк ; пад навук. рэд. А. В. Касовіча. – Мінск : БДПУ, 2017. – 204 с.
ISBN 978-985-541-392-0.

Дапаможнік грунтуецца на кароткіх апісаннях, лагічных схемах і тэкставых табліцах, якія паслядоўна раскрываюць асноўныя праблемы зместу курса методыкі выкладання гісторыі ў сучаснай школе. Утрымлівае кампаненты, неабходныя для арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў і фарміравання ў іх прафесійных кампетэнцый настаўніка гісторыі: прыведзены прыкладны план вывучэння кожнай тэмы, грунтоўны спіс навукова-метадычнай літаратуры і блок самакантролю вынікаў засваення, які складаецца з пытанняў і заданняў і тэставых заданняў па асноўных раздзелах курса методыкі выкладання гісторыі.

Адрасуецца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, выкладчыкам ВНУ і каледжаў, настаўнікам і ўсім, хто цікавіцца методыкай навучання гісторыі.

**УДК 94(075.8)**
**ББК 63.3я73**

**ISBN 978-985-541-392-0**

© Багдановіч І. І., Корзюк А. А., 2017
© Афармленне. БДПУ, 2017

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

***І. І. Багдановіч, А. А. Корзюк***

# МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ Ў ШКОЛЕ Ў АПІСАННЯХ, СХЕМАХ І ТАБЛІЦАХ

Рэкамендаваны вучэбна-метадычным аб'яднаннем па педагагічнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны,
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура,
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

Мінск
БДПУ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ТЭМА 8.3. ПРЫЁМЫ ВУСНАГА НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ

## План вывучэння тэмы

1. Месца і роля вуснага слова ў навучанні гісторыі. 2. Характарыстыка асноўных прыёмаў вуснага выкладання. 3. Патрабаванні да вуснага выкладу настаўніка.

## Кароткае апісанне асноўнага зместу тэмы

1. У сучаснай масавай школе вуснае слова на ўроках гісторыі ўсё больш саступае сваё месца друкаванаму слову і электронным сродкам навучання. Праціўнікі вуснага слова ў навучанні сцвярджаюць, што, слухаючы настаўніка, вучні застаюцца пасіўнымі, а франтальнае навучанне вядзе да навязвання вучням пункту гледжання настаўніка і выпрацоўвае ў іх, у адрозненне ад работы з першакрыніцамі і друкаваным тэкстам, калектыўныя формы мыслення. Не з'яўляючыся праціўнікам вывучэння гістарычных дакументаў, выкарыстання друкаваных і электронных сродкаў навучання, мы не можам пагадзіцца з довадамі прыхільнікаў выцяснення вуснага слова з вучэбнага працэсу. Толькі шырокае выкарыстанне вуснага слова забяспечвае фарміраванне ў школьнікаў інфармацыйна-камунікатыўных кампетэнцый.

У выкладанні гісторыі вуснае слова выконвае шэраг найважнейшых функцый. Перш за ўсё гэта вобразная, або апавядальна-апісальная, функцыя. Затым яно выконвае не менш важную для навучання развіццёвую, або лагічную, функцыю. Спалучэнне вобразнай і лагічнай функцый жывога слова дазваляе рэалізаваць яго выхаваўчую функцыю. Праз вобразнасць выкладання ажыццяўляецца эмацыянальнае ўздзеянне на пачуцці школьнікаў, дасягаецца суперыжыванне гістарычнай падзеі, вучні падводзяцца да маральных ацэнак мінулага, а логіка ўсведамлення сутнасці гістарычных падзей уздзейнічае на фарміраванне светапогляду і перакананняў школьнікаў і ўплывае на іх паводзіны.

Не менш важнай з'яўляецца арганізацыйная функцыя вуснага слова. З дапамогай слова настаўнік арганізуе і накіроўвае вучэбны



працэс, самастойную пазнавальную дзейнасць, фармуліруе заданні, указвае на шляхі і спосабы іх выканання, правярае і ацэньвае дзейнасць вучняў. Паспяховая рэалізацыя гэтых функцый дазваляе эфектыўна фарміраваць асноўныя кампетэнцыі выпускніка сучаснай школы.

2. Для таго каб паспяхова рэалізаваць закладзеныя ў вусным слове адукацыйна-выхаваўчыя магчымасці, неабходна авалодаць асноўнымі прыёмамі вуснага пераказу, распрацаванымі методыкай выкладання гісторыі. Асноўнымі відамі маналагічнай формы вуснага пераказу з'яўляюцца апавяданне, апісанне, характарыстыка, тлумачэнне і разважанне.

Дыялагічная форма вуснага выкладання заснавана на актыўным і цесным узаемадзеянні суб'ектаў працэсу навучання, якое скіравана на дасягненне пэўнай дыдактычнай мэты. Яе разнавіднасцямі з'яўляюцца гутарка, дыскусія, дыспут і г. д.

3. Вусны пераказ гістарычнага матэрыялу настаўнікам павінен быць даступным, наглядным і канкрэтным, рэзаніраваць з узростам, інтарэсамі, мысленнем і пачуццямі школьнікаў. Каб дасягнуць гэтага, настаўнік павінен звярнуць увагу на тры моманты. Па-першае, ён павінен развіць у сябе і ў дзецях памяць і творчае ўяўленне (фантазію), без якіх нельга стварыць змястоўныя вобразы гістарычнага мінулага. Канкрэтнасць і яснасць апісанняў надае гістарычнай карціне дзейснасць, якая здольная выклікаць суперажыванне.

Па-другое, настаўніку неабходна заўсёды памятаць, што ў вучняў, асабліва малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту, няма выразных уяўленняў аб мінулым, іх трэба стварыць. Каб выканаць гэту задачу, неабходна ўдасканальваць свае майстэрства апавядальніка.

Аднак у вуснага слова ёсць істотныя хібы, якія настаўнік павінен улічваць у сваёй рабоце. Вуснае слова прымусовае па тэмпе ўспрымання. Тэмп выкладу не павінен быць занадта хуткім (думка вучня не зможа паспяваць за тэмпам выкладу настаўніка), ні занадта марудным. Марудны тэмп выкладу прытупляе ўспрыманне і істотна зніжае інтарэс вучняў да аповеду настаўніка. Не дастатковая расчлянёнасць вуснага слова – яшчэ адзін яго недахоп, які настаўніку неабходна пераадольваць. У працэсе слухання вучням не заўсёды проста вычленіць галоўнае і істотнае.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ